ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
6 12 2018 г.

МАЙСТАР ЛЕСУ НЕ БАІЦЦА!

Самым складаным для маладога спецыяліста аказалася складаць справаздачы і запаўняць накладныя.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Дзелавую драўніну ў лясгасе закупляе каля 40 арганізацый. Дровы заказвае, апроч устаноў, яшчэ і насельніцтва. Калі вясковец хоча сам нарыхтаваць іх на зіму, то таксама павінен звярнуцца ў лясніцтва.

Хадзіць пешшу ўсё роўна даводзіцца шмат. Дзмітрый быў да гэтага гатовы — тым больш з яго спартыўным мінулым вялікія дыстанцыі не страшныя.

— Мы едзем на ўчастак, тачкуем дрэвы (замяраем іх дыяметр, каб потым разлічыць аб'ём лесаматэрыялу), на працягу аднаго-двух дзён афармляем дакументы. А пасля сочым, каб усё было зроблена па правілах і чалавек не ўзяў лішняга, — тлумачыць нам нюансы Дзмітрый.

За незаконную высечку давядзецца плаціць штраф, а таксама кампенсаваць шкоду, нанесеную лясному фонду. Сумы вялікія, але парушальнікі ўсё роўна ёсць — праўда, пільныя мясцовыя жыхары хутка пра іх паведамляюць.

Сочаць майстры і за тым, каб насельніцтва не звозіла ў лес смецце. Для гэтага ставяць фотапасткі. Дзмітрый прыгадвае, як нядаўна злавілі мужчыну, які прыцягнуў цэлы прычэп хламу. Добра, што выгрузіць не паспеў, — адправілі яго везці ўсё на звалку. Хлопец дзеліцца назіраннямі: звычайна выкінуць смецце не па правілах спрабуюць дачнікі. Мясцовыя жыхары больш берагуць лес.

Побач з будынкам лясніцтва стаіць акуратны драўляны домік. Тут у спецыяльнай «парылцы» сушаць шышкі. Зараз якраз пачаўся сезон іх збору.

— Атрыманае насенне потым перадаюць у гадавальнікі. А ў цяплiцах лясніцтва вырошчваюць дэкаратыўныя дрэвы, — праводзіць для нас кароткі экскурс Дзмітрый.

Клопатаў у майстра лесу хапае ў любую пару года. Вясной ідзе нарыхтоўка бярозавага соку. А з красавіка па кастрычнік — назіранне за пажарнай бяспекай. Работнікі дзяжураць на месцы з васьмі гадзін раніцы да дзесяці вечара. Прымаюць па рацыі паведамленні ад МНС і званкі ад вяскоўцаў.

«Звяры людзей не баяцца асабліва — на 20 метраў да іх падысці можна. Часам нават на УАЗіку пад'язджаеш — стаяць, не ўцякаюць».

— У выпадку чаго бочка з вадой і кіроўца заўсёды напагатове. Сур'ёзных пажараў у нашым лясніцтве, кажуць, даўно не было, — заўважае Дзмітрый.

На працы яму даводзіцца прымаць і званкі тых, хто заблудзіў. Каб падказаць, як выйсці з гушчару, хлопец просіць іх знайсці якое-небудзь характэрнае месца. Бывае, чалавек аказваецца побач з шыльдай, дзе напісаны абход лесніка, — тады яго лягчэй сарыентаваць.

Козырскае лясніцтва займае плошчу ў 11 тысяч гектараў. Для яе аб'езду ёсць два УАЗікі. Але хадзіць пешшу ўсё роўна даводзіцца шмат. Дзмітрый быў да гэтага гатовы — тым больш з яго спартыўным мінулым вялікія дыстанцыі не страшныя. У хлопца першы дарослы разрад па біятлоне і лыжных гонках. Цяперашні майстар лесу нават планаваў паступаць у вучылішча алімпійскага рэзерву, але на пашыранай медкамісіі яго «забракавалі». Спаборніцтвы з жыцця Дзмітрыя, праўда, не зніклі. Калі вучыўся, выступаў за ўніверсітэт, сёлета будзе бегаць за лясгас.

Цікавімся, ці шмат у гэтых мясцінах водзіцца звяроў. Хлопец успамінае, што сустракаў і аленяў, і казуль, і ліс. «Некаторыя нашы работнікі ласёў бачылі, але мне пакуль не трапляліся. Звяры людзей не баяцца асабліва — на 20 метраў да іх падысці можна. Часам нават на УАЗіку пад'язджаеш — стаяць, не ўцякаюць».

Падчас тачкавання дрэў.

Заробкі ў лясніцтве высокія: майстар можа атрымаць да 900 рублёў. Для маладых спецыялістаў прадугледжаны бонусы. Напрыклад, павышэнне службовага аклада на 20 працэнтаў. Тым, хто прыязджае з іншага раёна, даецца жыллё — домік побач з будынкам лясніцтва. А калі работнік арандуе кватэру, то яму часткова кампенсуюць выдаткі — тры базавыя велічыні (гэта 73,5 рубля).

Дзмітрый жыве ў Лагойску ў здымнай «аднушцы». Па яго словах, аднапакаёвую кватэру з добрым рамонтам і мэбляй у райцэнтры звычайна здаюць за 100—120 долараў у месяц, у горшым стане можна знайсці і за 80.

Хлопец сам родам адсюль. Любіць гэты ціхі гарадок, хоць у ім практычна няма забаў — нават кінатэатра. Але ёсць і іншая прычына, з-за якой малады спецыяліст вярнуўся на малую радзіму, — каханая дзяўчына. Пазнаёміліся яны гадоў сем таму, калі вучыліся ў адной школе. А распісаліся зусім нядаўна — у кастрычніку. Летам Дзімава жонка заканчвае БДПУ імя Максіма Танка, факультэт пачатковай адукацыі, і таксама вяртаецца на адпрацоўку ў райцэнтр.

Тэрыторыю лясніцтва Дзмітрый аб'язджае на УАЗіку, але хадзіць пешшу таксама даводзіцца шмат.

...Надыхаўшыся хвойным паветрам, ад'язджаем у сталіцу. А малады спецыяліст застаецца на варце прыроды: хутка зімовыя святы, і трэба пільнаваць, каб маладзенькія елкі сустрэлі новы год у лесе, а не ў чужых дамах.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.
Лагойскі раён.

Ідэі маладых

ХОЧАШ ЗМЯНІЦЬ СВЕТ? ПАЧНІ З... ПАРСЮЧКА

Як лагічна і прыгожа гаварыць, правільна выбудоўваць сваё выступленне, утрымліваць увагу аўдыторыі? Пра гэта расказаў падлеткам радыёвядучы, бізнес-трэнер Дзмітрый СМІРНОЎ падчас інтэрактыўнага майстар-класа «Майстэрства прэзентацыі», які быў арганізаваны кампаніяй velcom у рамках сацыяльна-адукацыйнага праекта. У ім удзельнічаюць больш як 800 старшакласнікаў з 236 навучальных устаноў: ад сталіцы, абласных і раённых цэнтраў да вясковых школ і школ-інтэрнатаў. Праект velcom YOUTH дайшоў да самых зацікаўленых і матываваных школьнікаў, якія прапанавалі цікавыя ідэі, што павінны змяніць наш свет да лепшага. Яго адметнасць у тым, што ўся камунікацыя (ад падачы заяўкі да прэзентацыі ў фінале) будзе весціся на беларускай мове.

Ад майстар-класа, напэўна, многія чакалі нешта накшталт урока ў школе. Але звычайна, банальна і проста — не пра гэта мерапрыемства. Удзельнікі займалі месцы ў зале пад мульцік-гісторыю, у якім бульба расказвала, адкуль яна ўзялася. Потым на экране з'явіўся **галоўны тэхнічны дырэктар кампаніі velcom Крысціян ЛАКЕ,** які натхніў школьнікаў на плённую працу: «Наша будучыня — за такой моладдзю, як вы! Слухайце адно аднаго, развівайцеся і кідайце сабе выклік. Рухайцеся наперад, будзьце лідарамі свайго пакалення і дапамажыце нам, дарослым, справіцца з гэтым рытмам, а магчыма, і паскорыць яго».

Затым увагу падлеткаў захапіў Дзмітрый Смірноў *(на здымку)*. Ён расказаў пра асноўныя прынцыпы якаснай і жывой прэзентацыі, а таксама растлумачыў правіла чатырох «с»: сваё, скандал, сенсацыя, смех — элементы, якімі стапрацэнтна можна прывабіць аўдыторыю. Прыкладамі з'яўляюцца Стыў Джобс і Ілан Маск — не толькі вынаходнікі, але і выдатныя прамоўцы.

Школьнікі былі актыўныя, бадзёрыя і жвавыя, падымалі рукі і не баяліся выказвацца. Падчас майстар-класа яны стараліся разабрацца, што такое ідэя, прапаноўвалі свае варыянты, як выкарыстоўваць будзільнік-кававaрку, агароджу-люстэрка, шчотку на пульце ад гульнявой прыстаўкі...

Больш за ўсё старшакласнікаў уразіў і натхніў на крэатыў хатні парсючок. Ім была пастаўлена задача — прарэкламаваць міні-піга. Выказваліся арыгінальныя і вясёлыя ідэі. Так, да плюсоў парсючка школьнікі аднеслі яго невялікі памер, адсутнасць шэрсці, якую пакідаюць кошкі і сабакі, і спосаб... напужаць гасцей. Адна з дзяўчат прапанавала набыць яго дзеля падтрымкі вегетарыянства — як хатняга гадаванца.

Ідэі, прадстаўленыя на конкурс, — нестандартныя, непаўторныя і разнастайныя. Напрыклад, дзесяцікласніца сталічнай гімназіі № 30 Насця Шыракоўская вырашыла звярнуць увагу на праблему аўтызму:

— Цікавасць да гэтай тэмы ў мяне з'явілася яшчэ ў дзяцінстве, — прызналася дзяўчына, — мне таксама хацелі паставіць дыягназ «аўтычнае расстройства», бо я доўга не размаўляла. На мой погляд, у нас не вельмі разбіраюцца ў гэтай праблеме. Калі падлетак хоча стаць праграмістам, яму кажуць: «Не, ты можаш стаць толькі агароднікам, бо ты аўтыст!» Таксама я назіраю за сынам мамінай сяброўкі, аўтыстам. Калі звычайных дзяцей просяць назваць жывёл, яны прыгадваюць ката, сабаку, вожыка... А хлопчык піша на паперы «рыба-меч», прычым з дэфісам, без мяккага знака — адпаведна арфаграфічным правілам. Гэта прымушае мяне думаць, што ў дзяцей-аўтыстаў не нізкія інтэлектуальныя здольнасці, а зусім наадварот. Думаю, у іх ёсць патэнцыял, які трэба развіваць.

Ідэя вучня 10 класа Замастоцкай сярэдняй школы Івана Трыпуза — стварыць акуляры ці лінзы, якія сфатаграфуюць наваколле так, як мы яго бачым, таму што сучасныя фотаздымкі не даюць тую ж якасць успрымання, як нашы вочы.

...Наступныя майстар-класы «Майстэрства выступлення» і «Майстэрства лідара» пройдуць у снежні і студзені. Падчас іх удзельнікі пачнуць рэалізоўваць свае ідэі: запісваць відэаролікі ў выглядзе майстар-класа, дэбатаў ці дыскусіі. У фінал будуць выбраныя толькі дзесяць чалавек. Яны атрымаюць магчымасць працаваць з найлепшымі ментарамі і прадставяць свае прэзентацыі на канферэнцыі TEDxYouth@Minsk у маі 2019 года.

Юлія АДАМОВІЧ,
студэнтка IV курса
факультэта журналістыкі БДУ.